можна гаварыць хіба ў сэнсе рэабілітацыі мастацкай традыцыі, перш за ўсё рэалізму. Мы б вызначылі мастацкі метад У.Гніламёдава як новы рэалізм, што на сучасным эстэтычным узроўні выкарыстоўвае дасягненні беларускага і сусветнага класічнага рэалізму.

Творы У.Гніламёдава ўжо сталі самай значнай з'явай сучаснага літаратурнага працэсу. Калі дадаць, што хутка будуць апублікаваны новыя часткі рамана "Валошкі на мяжы" і аўтар закончыў новую кнігу, у якой адлюстраваны падзеі Другой сусветнай вайны, то можна канстатаваць новы ўздым беларускай прозы, якая годна асэнсоўвае гістарычны лёс свайго народа.

**Літаратура**


1. П'едэстал для творцаў // Літаратура і мастацтва. – 2007. – 19 кастрычніка.
2. Локун, В. Проза Уладзіміра Гніламёдава / В. Локун // Полымя. –2009.– №2. – С. 165 – 173.
3. Гніламёдаў, У. Расія / У. Гніламёдаў. – Мінск : Харвест, 2007. – 672 с.



**І.В. Саматой** (Віцебск)


## АСВЕТНІЦКАЯ І ЛІТАРАТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АНДРЭЯ ЗЯЗЮЛІ

У горадзе Сянно Віцебскай вобласці пражыў апошнія гады і быў пахаваны Зязюля Андрэй (Астрамовіч Аляксандр Сцяпанавіч) – ксёндз, беларускі паэт-адраджэнец. Нарадзіўся 26 лістапада 1878 года ў сялянскай сям'і Сцяпана і Ганны Астрамовічаў, у вёсцы Навасады Гальшанскай гміны Ашмянскага павета (цяпер Астравецкі раён). Калі арыентавацца на прыхадскі спіс Гальшанскага рымска-каталіцкага касцёла за 1884 год, то датай нараджэння будучага паэта можна лічыць 1880 год. Пачатковую адукацыю атрымаў у Гальшанах. У 1892 годзе заканчыў Ашмянскае павятовае вучылішча. Пасля працаваў на гаспадарцы бацькоў. З 1 студзеня 1901 да 14 верасня 1903 года служыў у 160-м пяхотным Абхазкім палку ў Гомелі і ў Барысаве. Закончыў службу ў званні малодшага афіцэра.

Мара стаць святаром прыводзіць маладога Астрамовіча ў Вільню. Але паступіць у духоўную семінарыю перашкодзілі ўлады, якія не прынялі беларускасці Астрамовіча. Не пакідаючы надзеі, ён едзе ў студзені 1906 года ў Пецярбург, дзе здае экзамены на званне аптэкара, чым засведчыў веданне асноў лацінскай мовы, неабходнае для паступлення ў Пецярбургскую духоўную каталіцкую семінарыю, якую паспяхова скончыў у 1910 годзе і быў пасвечаны ў святары.

Душапастырскую дзейнасць пачаў вікарыем ракаўскага касцёла і першую сваю імшу адправіў 2 лютага 1911 года ў вёсцы Трабы Валожынскага павета. З 2 ліпеня 1912 і да лютага 1915 года служыў у парафіі Анопаль Мінскага дэканата. Пазней быў прызначаны вікарыем у Бабруйскую парафію. Са снежня 1916 года служыў у мястэчку Смілавічы Ігуменскага павета. З 9 верасня 1914 года ксёндз Астрамовіч служыць на Віцебшчыне: пробашч касцёла ў Абольцах Аршанскага дэканата. З 1919-1921 гг. А. Астрамовіч – апошні ксёндз касцёла Святой Троіцы ў мястэчку Сянно, дзе і памёр 17 студзеня 1921 года. Лічыцца, што пахаваны ён на мясцовых каталіцкіх могілках, але магіла не была знойдзена. Магчыма, што Астрамовіч як ксёндз пахаваны на дзядзінцы касцёла, які, на жаль, быў разбураны ў 1961 годзе. З 29 лістапада 2003 года ў час святкаванняў 125-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта Андрэя Зязюлі, на Сенненскіх могілках адбылося асвячэнне сімвалічнай магілы паэта.

Андрэй Зязюля быў вядомым культурным і грамадскім дзеячам пачатку XX ст. Літаратурная і асветніцкая дзейнасць яго была звязана з вытокамі беларускага хрысціянскага руху першай трэці XX ст., мэтай якога было адраджэнне дэмакратычнай, незалежнай Беларусі. Лідэр руху – публіцыст, тэолаг, філосаф, ксёндз Адам Станкевіч у

сваёй манаграфіі “Родная мова ў святынях” (1929) згадвае А. Астрамовіча з ліку іншых свядомых святароў-беларусаў і называе іх вернымі сынамі касцёла і свайго народа. Каталіцкія ўлады негатыўна ставіліся да беларускага святара, які ў паўсядзённым абіходзе і ў касцёле выкарыстоўваў родную для паствы беларускую мову і займаўся актыўнай прапагандай нацыянальнай культуры ў духоўным асяродку. Па гэтай прычыне ён не затрымліваўся надоўга на месцах сваёй працы, яго пастаянна пераводзілі з парафіі ў парафію. Але вымушаныя вандроўкі спрыялі той самаадданай працы, якую ён праводзіць на карысць сваёй радзімы і народа. У прадмове да пасмяротнага выдання выбраных твораў Андрэя Зязюлі Адам Станкевіч пісаў: “Усе тыя куткі Ашмяншчыны і Валожыншчыны, як Гальшаны, Трабы, Вішнёва, Баруны, Крэва, дзе часта бываў Зязюля, помняць яго і сёння. Нёс ён туды прамень праўды, святла беларускай народнай свядомасці як жывым словам, так і праз родную кніжку і газету, Зязюля – гэта праўдзівы ідэаліст, гэта мучанік за родную ідэю” [1, с. 3].

Пісаць вершы А. Астрамовіч пачаў у семінарыі. Стасункі са свядомым беларусам-каталіком ксяндзом А. Ластоўскім, які пазнаёміў будучага паэта з творчасцю пачынальнікаў нацыянальнай літаратуры Ф. Багушэвічам, з беларускімі катэхізмоўкамі ксяндзоў С. Дзенісевіча і Ф. Будзькі, абудзілі цікавасць да паэзіі. Падчас вучобы ён наведвае беларускі гурток вядомага вучонага і грамадскага дзеяча Б. Эпімах-Шыпілы, садзейнічае арганізацыі беларускай секцыі пры казнадзейскім гуртку ў семінарыі. Менавіта ў гэты час малады паэт абірае сабе псеўданім Андрэя Зязюлі. Фальклорным вобразам прарочай птушкі зязюлі паэт усведамляе сваю паэтычную творчасць як прароцтва – прароцтва свабоды, чысціні, лепшай, шчаслівай долі для народа.

Першы верш “Песня дзяўчаці” быў надрукаваны ў газеце “Наша Ніва” за 1909 год. Твор засведчыў паэтычную сталасць творцы, які валодае майстэрствам псіхалагічнай характарыстыкі лірычнага героя.

Большасць ранніх вершаў 1909-1912 гг. друкавалася ў адражэнскай “Нашай Ніве”. Падчас супрацоўніцтва з ёй А. Астрамовіч знаёміцца і распачынае сяброўскія стасункі з Янкам Купалам. Пасля заснавання першай беларускай каталіцкай газеты “Беларус” (“Bielarus”, 1913-1915) вершы Зязюлі сталі візітнай карткай гэтага адраджэнска-асветніцкага выдання. У 1914 годзе ў выдавецтве “Беларуса” быў апублікаваны адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў А. Зязюлі на лацінцы “З роднага загону”. Друкаваўся таксама ў газетах “Светач” (1916). “Вольная Беларусь” (1917-1919), “Беларуская крыніца” (1917, 1918, 1921), “Беларуская рада” (1917), “Беларускае жыццё” (1919) і інш. Асобным выданнем пры жыцці паэта была апублікавана яго асветніцкая паэма “Слова праўды аб мове і долі беларусаў” (Петраград, 1917). Пасля смерці паэта у 1923 годзе ў Вільні друкуецца поўны збор твораў Андрэя Зязюлі “З роднага загону”. У прадмове да выдання А. Станкевіч адзначаў, што шмат вершаў паэта-святара не ўвайшлі ў яго. Нявыяўленыя творы засталіся ў рукапісах і захоўваліся ў архівах Б. Эпімах-Шыпілы, Янкі Купалы, архіў якога згарэў разам з домам у першыя дні вайны. У 1993 годзе выйшла рэтапрынтнае выданне апошняга зборніка твораў паэта.

Адметная асаблівасць паэзіі Андрэя Зязюлі – у выяўленні пафасу ўзнёслага творчага мыслення паэта, у мастацкай перадачы субліміравана ўспрымаемай ім рэчаіснасці, усвядомленых ідэалаў, пачуццяў. Асэнсаванне рэчаіснасці базіруецца пераважна на эстэтычных прынцыпах. У вершах адлюстроўваецца імкненне аўтара і лірычнага героя да свету красы і прыгажосці, вяршыняй якога ёсць Бог. Чалавек ў вершах А. Зязюлі паўстае не ў праявах сваёй грахоўнасці, а ў патэнцыі святасці. Ён здольны наблізіцца да ідэальнага свету дабра і прыгажосці, а, значыць, і да Бога. Гарманічнае суіснаванне двух пачаткаў Боскага і зямнога прысутнічае ў чалавеку, але яно дасягаецца толькі праз хрысціянскія маральныя каштоўнасці.

Усе творы А. Астрамовіча паводле зместу і стылю – хрысціянскія і асветніцкія: гэта гутаркі добрага пастыра са сваімі духоўнымі дзецьмі. Сутнасць яго філасофіі адлюстроўваецца ў любові да Бога і чалавека, як божага тварэння. Але найперш адлюстравана любоў да Беларусі, роднага народа, беларускай мовы, культуры, народнага побыту. Афарыстычна яна выражаецца ў назве вершаванага зборніка “З роднага загону”.

Па змесце зборнік складаецца з шасці раздзелаў: вершы рэлігійныя, народныя, пра беларускае жыццё, беларуская прырода, родныя настроі і розныя.

Для твораў рэлігійнай тэматыкі характэрна глыбокая набожнасць, хрысціянская змірэнне духа, элегічны настрой. Але элегічны сум паэта не бывае безнадзейным, ён прасветлены верай у лепшую будучыню, што дапамагае выйсці са стану журбы, які, у разважаннях аўтара, аддаляе чалавека ад  Бога. Хрысціянскія ідэі служэння Богу і людзям выразна адлюстраваны ў вершах Зязюлі. Здольнасць пачуць гора чалавека, прыйсці яму на дапамогу ўспрымаецца паэтам за асабістае шчасце. А хрысціянскі сімвал крыжа разумеецца не толькі як цярплівае перанясенне жыццёвых выпрабаванняў і асабістага лёсу, а найперш як актыўная праца на ніве духоўнага адраджэння і самаўдасканалення.

Хрысціянскія матывы служэння Богу спалучаюцца ў лірыцы Зязюлі з глыбокім патрыятызмам, любоўю да роднага краю, да народа, з жывым хваляваннем за лёс Беларусі. Творы нацыянальна-патрыятычнай тэматыкі вызначаюцца публіцыстычным гучаннем, што выражаецца ў пафасе адмаўлення рэгрэсіўных тэндэнцый у беларускім грамадстве, у глыбокай пашане да Радзімы і верай у лепшую будучыню краіны. Элегічны сум змяняюць мажорныя ўзвышэнскія матывы, распачатыя ў беларускай паэзіі Янкам Купалам.

У паэме “Слова праўды аб мове і долі беларуса” аўтар уздымае праблемы гістарычнага развіцця роднай мовы і культуры беларусаў. Найбольш акцэнтуецца ўвага на тэндэнцыях паланізацыі і русіфікацыі народа праз касцёл і царкву, у чым для аўтара бачыцца прычына малавер’я, скажэння маральных нораваў у людзях. Выразнасць зместу ўзмацняюць трапная метанімізацыя і народная лексіка.

У творах тэматычнага раздзела “Беларускае жыццё” выяўляецца пранікненне паэта ў рэальнасць сялянскага побыту. У вершах А. Зязюлі зафіксавана самабытная традыцыйная культура беларускай вёскі, што ўяўляе не толькі эстэтычную, але і этнаграфічную каштоўнасць. Гэта ўзор паэтызацыі цяжкай сялянскай працы.

У паэме “Аленчына вяселле” паэт звяртаецца да рэдкай па тым часе тэмы жаночага лёсу. Створаны ім вобраз – абагульненая сімвалічная тыпізацыя вобраза сялянскай дзяўчыны, карані якога – у народна-песеннай і казачнай традыцыі беларускага фальклору. Вобразную яскравасць твора ўзмацняе фальклорны прыём псіхалагічнага паралелізму, суаднесенасць асноўных перыядаў жыцця чалавека з адпаведнай парою года, ужыванне фальклорнай сімволікі.

Для пейзажнай лірыкі А. Зязюлі характэрна ўнутраная медытатыўнасць, якая выяўляецца ў эмацыйнай экспрэсіўнасці мастацкай мовы і ў выразным “прадметным” выяўленні. У вершах адчуваецца не толькі глыбокая еднасць, адзінства чалавека з прыродай, але і пачуццё залежнасці жывой істоты ад навакольнага асяроддзя. Паэт стварае дынамічную кампазіцыю гадавога цыкла жыцця прыроды і жыцця селяніна з традыцыйным народным мастацкім досведам быцця, для якога характэрны сінкрэтызм хрысціянскіх і язычніцкіх уяўленняў пра навакольны свет. У стварэнні цыкла аўтар арыентуецца на беларускі народны каляндар, у якім канцэпцыя быцця выяўляецца ў знітаванасці Боскага і зямнога ў светаўспрыняцці чалавека, своеасаблівы эстэтычны мастацкі пантэізм.

Андрэя Зязюля – паэт, у першую чаргу, народны, сялянскі. Менавіта ў сялянстве ён бачыць аснову адраджэння роднага краю. Адраджэнне ў людзях веры, надзеі, любові да Беларусі, яе культуры, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, праўдзівасці, імкненне да хрысціянскіх ідэалаў – галоўныя мэты жыцця і творчасці Андрэя Зязюлі.

**Літаратура**

1. Зязюля, А. З роднага загону./ А.Зязюля. – Мінск: Маст. літ., 1993. – С. 3.

**Т.Г. Симонова** (Гродно)

## ЖАНР МЕМУАРНОЙ ХРОНИКИ В ТВОРЧЕСТВЕ В. БЫКОВА («ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ»)

Одной из заметных тенденций современной литературы является усиленное внимание к мемуаристике как возможности запечатлеть черты былого, отраженные современником и участником минувших событий сквозь призму его личностного восприятия. Интерес к прошлому закономерен для переходного периода, в ситуации которого развивается литература сегодня, поэтому многочисленные воспоминания в большой степени определяют характер словесности нашего времени.

Среди жанрового разнообразия мемуарных книг выделяется мемуарная хроника – объемное и фундаментальное исследование минувшей эпохи. История развития литературы убеждает, что мемуарная хроника – результат всего жизненного и творческого опыта писателя, подведение итогов значительному историческому отрезку времени. Таковы книги И.Эренбурга «Люди, годы, жизнь», А.Солженицына «Бодался теленок с дубом», «Угодило зернышко промеж двух жерновов», Р.Гуля «Я унес Россию», Н.Берберовой «Курсив мой» и др.

В.Быков – первый белорусский писатель, реализовавший в рамках национальной литературы жанровые возможности мемуарной хроники, что вызвало к жизни произведение широкого исторического диапазона «о времени и о себе». Мемуарная хроника чрезвычайно емка и насыщенна. Она включает в себя большинство жизненных впечатлений, оказавшихся в поле зрения писателя: судьба советской белорусской деревни в 20–30-е годы, война, положение в послевоенной армии, литературная жизнь, участь писателя в советском государстве, политическая действительность в СССР. История, политика, частная жизнь в свете авторской оценки прошлого образуют тот сплав, из которого создается широкая панорама исторического бытия. Жизнь а, тех автобиографического героя предстает на историческом фоне. Автобиографическая и историческая линии сосуществуют на равных, действенно дополняя одна другую. Объединяя единичное, частное и значительное, исторически важное, мемуарная хроника отражает движение действительности в ее многообразных проявлениях.

Воспоминания тяготеют к хронологической последовательности рассказа, тем не менее повсеместно она не выдерживается. Хотя основной мемуарный сюжет подчиняется общему поступательному движению времени, введение дополнительных эпизодов, тематических направлений обусловливает временную инверсию – свободное чередование разновременных пластов и связанных с ними фактов. Чтобы дополнить или завершить заявленную тему, писатель обращается к освещению прошлого, выходящего за пределы конкретного обстоятельства, забегает вперед, показывая, что произошло в будущем, за пределами основного рассказа. Поток повествования дробится, в нем выделяется ряд самостоятельных фрагментов. Это обеспечивает завершенность отдельных тематических линий и в конечной мере предопределяет целостность всего произведения.